«Вясна» — экстрэмісцкае фармаванне.
Што трэба ведаць?

Падтрымай "Вясну" на PATREON

За абразу прэзідэнта і міністра ўнутраных спраў - адзін год і 3 месяцы пазбаўлення волі

25.01.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед, дыфамацыя



Уладзімір Чыжэўскі.

Суд Астравецкага раёна ў складзе суддзі **Дзмітрыя Багдановіча**, з удзелам дзяржаўнага абвінаваўцы **Аляксея Тамчанка** 18 студзеня разгледзеў крымінальную справу па абвінавачванню мясцовага жыхара **Уладзіміра Чыжэўскага** ў здзяйсненні злачынстваў, прадугледжаных ч.1 арт. 368 (абраза Прэзідэнта) і арт.369 (абраза прадстаўніка ўлады).

Уладзімір Чыжэўскі абвінавачваўся ў тым, што 1 верасня мінулага года ў групе “Астравец для жыцця” месэнджара “Тэлеграм” пад нікам Talash пракаментаваў відэа, у якім Прэзідэнт даў ацэнку дзеянням улады адносна Кандрусевіча. Пры гэтым меў несцярожнасць выкарыстаць ненарматыўнае слова. Якое? У прысудзе не абвяшчалася, але ў чаце можна пабачыць, што гэта слова, відавочна, “д...”.

А 28 кастрычніка мінулага года Уладзімір Чыжэўскі ў той жа групе пракаментаваў відэа, у якім міністр МУС **Юрый Караеў** выказаўся, у які момант небяспекі міліцыянер мусіць вырашаць пытанне аб выкарыстанні зброі. У каментары таксама ўжыў ненарматыўнае слова і словазлучэнне. І пазней дадаў, як сведчыць прысуд, негатыўную ацэнку словазлучэннем “не мае права называцца чалавекам”.



заключения под стражу, взяв обвиняемого под стражу в зале суда – меру пресечения Чижевскому Владимиру Чеславовичу в виде заключения под стражу оставить до вступления приговора в законную силу.

Срок отбывания наказания Чижевскому Владимиру Чеславовичу в виде лишения свободы исчислять с 18 января 2021 года.

Зачесть в срок наказания в виде лишения свободы Чижевскому Владимиру Чеславовичу один день задержания 13 ноября 2020 года, из расчета один день содержания под стражей соответствует одному дню лишения свободы.

Имущество, на которое при досудебном производстве был наложен арест: стиральную машину марки «LG», телевизор марки «Horizont», принадлежащие Чижевскому В.Ч. – от ареста освободить и передать владельцу Чижевскому В.Ч.

Вещественные доказательства по делу: мобильный телефон «Xiaomi Redmi Note 4», IMEI 867309030587783 – конфисковать; DVD-диск «ELLITEX» на котором записана видеозапись с ходом осмотра информации, содержащейся в глобальной сети Интернет, а именно «Островец Для Жизни» в приложении «Телеграмм», CD-диск «ESPERANZA» и DVD-диск «SMARTTRACK» с аудиозаписью принятия объяснения у Чижевского В.Ч., моментальный снимок экрана с комментариями в группе «Островец Для Жизни» в приложении «Телеграмм», моментальный снимок экрана с комментариями в группе «Пул Первого» в приложении «Телеграмм» – хранить в материалах дела в течение всего срока его хранения.

Приговор может быть обжалован и опротестован в Гродненский областной суд через суд Островецкого района в течение десяти суток со дня провозглашения, а обвиняемым в тот же срок со дня получения копии приговора.

Председательствующий Д.В. Богданович

Верно
Приговор не вступил в законную силу
Судья суда Островецкого района
Д.В. Богданович
«18» 01 2021

У выніку суддзя Багдановіч за абразу Прэзідэнта прысудзіў Чыжэўскаму 1 год і 3 месяцы пазбаўлення волі.

І гэта нягледзячы на тое, што ў самім каментары пасля ненарматыўнага слова Уладзімір адразу напісаў, што просіць прабачэння за яго выкарыстанне.

За абразу ж міністра – 3 месяцы арышту. Шляхам паглынання менш строгага пакарання больш строгім канчатковае пакаранне – 1 год і 3 месяцы пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму.

Прысуд пакуль не ўступіў у законную сілу.

𝕏 Опубликовать



СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

"З мэтай вядзення дэструктыўнай дзейнасці". За ўдзел у акцыях пратэсту асудзілі двух братоў і жонку аднаго з іх

Удзельнічаў у Маршы свабоды, заклікаў да ўдзелу ў акцыях: мінчука асудзілі да "хатняй хіміі"

Халодны травень 2020 года: усплеск грамадзянскай актыўнасці і першая хваля рэпрэсій

Да 1,5 года калоніі. Яшчэ пяць чалавек асудзілі за ўдзел у пратэстах 10 жніўня 2020 у Брэсце

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



Гісторыя аднаго зварота. Як дзве жанчыны абаранілі свае правы

"Як захаваць сябе ў час працяглага зняволення?" Адкрыты запіс падкаста "Вясна прыйдзе" ў Дзень палітвязняў Беларусі

Беларусы на "крытай": як палітвязняў працягваюць пераследаваць у калоніях (дапоўнена)

"Жыццё ў пенітэнцыярных установах грунтуецца на гвалце". Праваабаронца "Вясны" — на Стакгольмскай канферэнцыі па Беларусі



ГАЛОЎНАЕ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Травень 2024



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Амністыя-2024: у гонар вызвалення Беларусі без вызвалення палітычных вязняў

Праваабаронцу Леаніда Судаленку завочна судзяць за садзейнічанне экстрэмісцкай дзейнасці

"Мы тут, бо так кажуць нашыя сэрцы": акцыя салідарнасці з палітзняволеным адвакатам Максімам Знакам (фота)

Дзянісу Дзікуну дадалі 2 калоніі па новай крымінальнай справе. Ён падаў апеляцыйную скаргу

Вынікі першага дзесяцігоддзя новага этапу сусветнай барацьбы з прымусовай працай. Досвед Беларусі і яе бліжэйшых суседзяў

Супрацоўнікаў санаторыя "Беларусь" асудзілі за "агентурную дзейнасць" і "здраду дзяржаве" (дапоўнена)

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Травень 2024

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Выбары*2024







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

Anti-Discrimination Centre Memorial

Московская Хельсинкская Группа

СЯБРОЎСТВА

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

european platform for democratic elections
epde

AMNESTY INTERNATIONAL

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў baj.by

VOICE OF BELARUS

БЕЛАРУСКІ ХЕЛЬСІНКСКІ КАМІТЭТ

#BYSOL

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY